DOI 10.33294/2523-4234-2019-29-1-331-341

**Барыс Лазука**

# Канфесійныя і этнічныя ўмовы развіцця барочнага стылю ў мастацтве Беларусі

Разглядаюцца заканамернасці развіцця стылю барока ў пластычных мастацтвах Беларусі, абумоўленыя грамадска-палітычнымі, саслоўнымі, канфесійнымі фактарамі. Канфесійны склад грамадства беларускіх зямель знаходзіўся ў цеснай узаемасувязі з этнічным падзелам. Па ўплыву на культурна-мастацкі працэс асноўнымі канфесіямі ў XVII–XVIII стст. былі каталіцкая, уніяцкая і праваслаўная. Іх роля залежала ад перыядычнасці дамінавання, фаз актыўнага функцыянавання, спецыфікі ўзаемаадносін. Пераўтварэнне каталіцызму ў рэлігію эліты, пашырэнне ўніяцтва ў сярэдніх і нізавых слаях грамадства, яго арыентацыя на элементы народнай культуры, кансерватыўныя адносіны праваслаўя да мастацтва – дадзеныя фактары аказвалі ўплыў на стылявыя працэсы барочнай эпохі.

*Ключавыя словы:* стыль барока, пластычныя мастацтвы, канфесіі, каталіцызм, праваслаўе, уніяцтва

**Борис Лазука**

**Конфесійні та етнічні умови розвитку стилю бароко в мистецтві Білорусі**

Розглядаються закономірності розвитку стилю бароко в пластичних мистецтвах Білорусі в контексті умов історичного процесу, зумовленого комплексом суспільно-політичних, станових, конфесійних, освітніх, економічних обставин. З їх сукупності виділено конфесійний та етнічний склад населення білоруських земель, які в другій половині XVI–XVIII ст. входили до складу Великого Князівства Литовського. Звернуто увагу на тісний взаємозв'язок конфесійного та етнічного чинників. Зазначається, що чисельність населення білоруських земель не була стабільною, що зумовили військові дії, міграції, мінливість економічної, політичної та конфесійної ситуацій в державі.

За кількістю віруючих та впливом на культурно-мистецькі процеси в суспільстві основними конфесіями у XVII–XVIII ст. були католицька, уніатська та православна. Їхня роль залежала від періодичності домінування, фаз активного функціонування, специфічність взаємин. Перетворення католицизму на релігію еліти, поширення уніатства в середніх і низових верствах суспільства, його орієнтація на народну культуру, консервативне ставлення православ'я до мистецтва – фактори, які безпосередньо впливали на стильові процеси епохи бароко.

Ставлення названих конфесій до мистецтва, його роль у відправленні богослужіння були неоднаковими. Найбільш виваженими були стосунки католицької конфесії, яка оцінювала мистецтво як важливий засіб емоційного сприйняття Святого Письма в художніх образах. Перетворення католицизму на релігію еліти, поширення уніатства в середніх і низових верствах суспільства, його орієнтація на елементи народної культури, консервативність ставлення православ'я до мистецтва – чинники, які мали безпосередній вплив на стильові процеси протягом всієї барокової епохи.

Приділено увагу ролі представників інших конфесій – протестантів, старообрядців, іудеїв, мусульман, які також вплинули на розвиток барокового стилю.

Протягом XVII–XVIII ст. білоруські землі перебували в центрі європейського міжконфесійного та культурного діалогу. Особливості їхньої культури в той час були зумовлені поліконфесійністю суспільства, стали результатом тривалої взаємодії і контактів різних конфесій.

*Ключові слова*: стиль бароко, пластичні мистецтва, конфесії, католицизм, православ'я, уніатство

З сукупнасці грамадска-дзяржаўных, саслоўных фактараў, якія ўплывалі на развіццё барочнага стылю ў беларускіх пластычных мастацтвах XVII–XVIII стст., разам з асаблівасцямі тагачаснай сістэмы адукацыі, уключанасці творчай асобы ў грамадска-рэлігійныя аб’яднанні і цэхавыя арганізацыі, у рынак твораў мастацтва, трэба прызнаць асабліва значную ролю канфесійнага і саслоўнага станаў грамадства. Іх значэнне і характар развіцця належыць разглядаць як узаемаабумоўлены працэс, што дае магчымасць сканцэнтраваць увагу на найбольш важных унутрыстылявых барочных тэндэнцыях у пластычных мастацтвах.

Аналізуючы характар і накіраванасць культурнага працэсу XVII–XVIII стст. на беларускіх землях, як і ва ўсім Вялікім Княстве Літоўскім, мэтазгодна звярнуць увагу на этнічны склад грамадства. Ён уяўляў сабой дастаткова дынамічную сістэму, на якую ўздзейнічалі розныя фактары. Па падліках гісторыкаў, колькасць насельніцтва беларускіх зямель на працягу XVII–XVIII стст. мянялася вельмі рэзка, што было абумоўлена бесперапыннымі ваеннымі дзеяннямі і звязанымі з імі разбурэннямі гаспадаркі, знішчэннем людзей, масавымі згонамі за мяжу. У сярэдзіне XVII ст. насельніцтва беларускіх зямель складала 2826 тыс. чалавек [1, s. 390–393]. Пасля трынаццацігадовай вайны з Маскоўскай дзяржавай (1654–1667) яно паменшылася да 1146 тыс. чалавек [2, с. 223] – больш чым на палову. Адносна мірныя гады канца XVII ст. далі нязначны прырост насельніцтва да 1904 тыс. чалавек.

Новы спад колькасці жыхароў на беларускіх землях адбыўся падчас Паўночнай вайны (да 1457 тыс.), разбурэнні якой былі не менш значнымі, аднак не прынеслі з сабой масавага знішчэння людзей. З другой трэці – канца XVIII ст. рост насельніцтва хаця і адбываўся, але вельмі маруднымі тэмпамі. У 1795 г. яно складала толькі 2600 тыс. чалавек [3, с. 91; 4, с. 86–92]. І. Чаквін і І. Углік называюць іншую лічбу – 1352 тыс. Е. Можы, абапіраючыся на дакументальныя крыніцы, лічыць, што за перыяд з 1648 г. да 1667 г. страты насельніцтва ў Вялікім Княстве Літоўскім склалі 48%, а ў час Паўночнай вайны – 35%. Па падліках В. Голубева ў Прапойскім старостве ў 1681 г. пуставала 72% валок, у 1667 г. у Віцебскай эканоміі было 74%, а ў Мсціслаўскім ваяводстве каля 70% пустых сялянскіх дамоў. Пасля падзей Паўночнай вайны і ў выніку спусташальнай эпідэміі чумы ў пачатку XVIII ст. толькі ў Берасцейскай і Гродзенскай эканоміях пуставала адпаведна 41% і 71,5% валок [5, с. 120; 1, s. 390–393; 3, с. 91]. Такім чынам, можна меркаваць, што ва ўмовах ваенных дзеянняў, крызіснага становішча гаспадаркі, разбурэннямі гарадоў і мястэчак, памяншэннем заможнасці саслоўных элітных частак грамадства, працэсы культурнага развіцця не толькі запавольваліся, але і набывалі новыя накірункі.

Разам з памяншэннем колькасці насельніцтва значныя карэктывы ў карціну культурнай сітуацыі ўносілі міграцыі. Масавы вываз рамесніцкага і ўвогуле працаздольнага насельніцтва адбываўся перыядычна. Да гэтага трэба дадаць унутрыдзяржаўныя міграцыі ў асноўным з заходніх раёнаў ва ўсходне-паўночныя, усходнія і паўднёвыя [5, с. 121; 6, с. 57–64]. Яны абумоўліваліся магчымасцю засялення пустуючых вёсак, мястэчак і гарадоў. Асабліва актыўным быў прыток

новых жыхароў ва ўсходне-паўднёвыя раёны вясковага і рамесніцкага насельніцтва. Нягледзячы на тое што ў аснове такіх перамяшчэнняў людзей ляжалі эканамічныя фактары, яны прыводзілі да актыўнага змяшэння культурных патокаў, уплывалі на далейшае развіццё культурнай сітуацыі. Кансалідацыя, асіміляцыя і інтэграцыя насельніцтва садзейнічалі выпрацоўцы агульных рыс хутчэй за ўсё ў матэрыяльнай культуры, больш марудна – у сямейна-побытавым укладзе, традыцыях, абрадах, у мастацкай, вусна-паэтычнай творчасці.

У этнічных адносінах на беларускіх землях у XVII–XVIII стст. пераважала беларускамоўнае насельніцтва. Аднак у сувязі з адметнасцямі саслоўнага падзелу грамадства гэта сцвярджэнне патрабуе некаторых карэктываў. На працягу разглядаемага перыяду адбываўся працэс паланізацыі шляхты, якая ў выніку складаных абставін, выкліканых палітыкай дзяржаўных улад і каталіцкай царквы, склала "своеасаблівую метаэтнапалітычную супольнасць" з адпаведнымі кампанентамі польскай культуры [5, с. 120–121] – мовай, канфесійнай прыналежнасцю, самасвядомасцю. Трэба адзначыць, што гаворка ідзе аб кампанентах культуры, разам з якімі можна заўважыць і пэўныя з'явы, арыентаваныя на беларускі традыцыйны ўклад. Падкрэслім яшчэ адзін момант. Развіццё і замацаванне ў адпаведных формах у асяроддзі шляхты элементаў ментальнасці, уласцівых асобным этнічным супольнасцям, спрыяла шырокаму ўваходжанню ў сферу яе інтарэсаў інавацый, рабіла гэтае саслоўе схільным да зменлівасці, поліварыянтнасці ў адносінах да культуры, а значыць аказвала ўздзеянне на накіраванасць развіцця барочнага стылю.

"Этнатрансфармацыйны характар" [5, с. 121] шляхты быў не аднаго ўзроўню. Так, яе вышэйшыя слаі па прычыне ўжо вышэй адзначаных абставін, ладу жыцця мелі больш выказаную схільнасць да інаэтнічных запазычанняў. У большай ступені яны не насілі характар простага ўспрыняцця таго ці іншага ўздзеяння. Часцей за ўсё запазычанае аказвалася трансфармаваным, прыстасаваным да таго варыянту, які склаўся ці які ў ідэале, на думку прадстаўнікоў шляхты, павінна было мець данае саслоўе. У гэтым плане большымі асіміляцыйнымі здольнасцямі валодала сярэдняя і дробная шляхта. Канстантнасць, ахоўніцтва сармацкай культуры, як сукупнасці пэўных кампанентаў светапогляду, матэрыяльнага і духоўнага жыцця, тыповая для яе, з'ўлялася асноўным сродкам і арыенцірам у названых працэсах.

На беларускіх землях у XVII–XVIII стст. пражывалі вялікія групы іншых этнасаў. Сярод асноўных (не ў плане большасці, а па ступені ўплываў, укладу ў агульную культуру Вялікага Княства Літоўскага) трэба назваць палякаў, рускіх, яўрэяў, украінцаў, татар, цыганоў. Так, палякі, нягледзячы на існуючыя ў дзяржаве пэўны час забароны і абмежаванні, аказвалі значны ўплыў на варыятыўнасць культурнай сітуацыі. На землях Вялікага Княства Літоўскага палякам забаранялася займаць дзяржаўныя пасады, атрымліваць тытулы, набываць нерухомасць. Гэтыя забароны (у большасці выпадкаў фармальныя) дзейнічалі да канца XVIII ст. [7, с. 511]. У асноўным, дзякуючы каталіцкай царкве (часта этнічнае і канфесійнае праяўляла сябе злітна), іх уклад меў шырокія межы і прасціраўся ад матэрыяльнай да духоўнай сферы культуры.

Цэлы комплекс з’яў у беларускай культуры XVII–XVIII стст. нельга зразумець без уліку рускага насельніцтва. Гісторыкамі праводзіцца яго дыферэнцыяцыя на дзве асноўныя групы – рускія (велікаросы) і стараверы. І адных, і другіх у рознага роду дакументах, прыватным жыцці называлі “масквічы”, “маскавіты”, “маскалі”, радзей “рускія” [5, с. 131–132]. У гэтых назвах знайшла адлюстраванне дзяржаўна-патэстарная прыналежнасць, якая часта атаясамлівалася як уласна этнічная. Для рускіх праваслаўных і рускіх старавераў былі характэрны розныя ступені ўздзеянняў і ўдзелу ў культурным працэсе, як і розныя варыянты ўключэння ў грамадска-палітычнае жыццё краіны, розныя адносіны да дзяржаўных улад, каталіцкай, уніяцкай, праваслаўнай цэркваў. На рускіх, якімі былі ў пераважнай большасці людзі праваслаўнага веравызнання, распаўсюджваліся тыя ж правы, абавязкі, абмежаванні (у параўнанні з прадстаўнікамі уніяцкай і каталіцкай канфесій), што і на беларускае праваслаўнае насельніцтва.

У гэтым плане стараверы ўспрымаліся дзяржаўнымі ўладамі Рэчы Паспалітай як асобы, на якіх пашыраліся пэўныя свабоды, галоўным чынам у адпраўленні культу, у ажыццяўленні гандлёвай і гаспадарчай дзейнасці, незалежнасць ад каталіцкага і ўніяцкага духавенства. Характар сувязі рускага (праваслаўнага) і старавераскага насельніцтва з прадстаўнікамі іншых этнасаў, якія пражывалі на тэрыторыі Беларусі, быў розным. Аднак адмаўляць яе, асабліва ў адносінах да старавераў, як гэта робяць некаторыя даследчыкі (А. Катунскі, Я. Яваніц) [8; 9], нельга па шэрагу прычын. Даныя аб гаспадарчай дзейнасці, гандлёвых сувязях старавераў не пакідаюць сумненняў у наяўнасці рознабаковых (хай і абмежаваных па прычыне канфесійнай спецыфікі) кантактаў з іншымі жыхарамі краю. А гэта азначае і тое, што на працягу амаль паўтара стагоддзя стараверы аказвалі вызначанае ўздзеянне на культурную сітуацыю ў асобных рэгіёнах краіны (паўночны захад, усходне-паўднёвыя раёны) [10]. Такія ўздзеянні можна прасачыць на ўзроўні мовы, матэрыяльнай культуры, некаторых з’яў у галіне мастацтва (іканапіс, рукапісныя кнігі, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, архітэктура).

Уздзеянне на гісторыка-культурную сітуацыю на беларускіх землях аказвалі таксама яўрэі. Нягледзячы на пастаянныя сцвярджэнні гісторыкаў аб выключнай важнасці разгляду вялікага кола пытанняў, звязаных з дзейнасцю гэтай часткі насельніцтва, яе ўкладу ў агульнадзяржаўныя працэсы, да сённяшняга часу адсутнічаюць грунтоўныя даследаванні, а выпадковыя заўвагі статыстычнага характару не запаўняюць існуючага прабелу.

На тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага яўрэі з’явіліся ў канцы XIV ст., рассяляючыся пераважна ў гарадах і мястэчках. Іх становішча як пэўнай этнічнай адзінкі ў дзяржаве на працягу XVII–XVIII стст. неаднаразова мянялася ад масавых выгнанняў да простага абмежавання месц пражывання, сфер дзейнасці. Колькасць яўрэяў таксама не была пастаяннай. Калі ў XIV–XVI стст. яны складалі да 20% ад усяго гарадскога насельніцтва [11, с. 119–144], то ў другой палове XVIII ст. – да 30–40% у гарадах і да 50% у мястэчках [12, s. 30–31]. Гэта, безумоўна, важны

паказчык. Аднак трэба ўлічваць і тое, што яўрэі займаліся пераважна рамяством, гандлем, ліхвярствам, лекарствам, яны трымалі млыны, корчмы, фальваркі і, такім чынам, знаходзіліся ў цэнтры гаспадарчага, грамадскага жыцця. Не апошняй была роля яўрэяў і ў палітычным жыцці. Такія абмежаванні, як, напрыклад, месца пражывання, не станавіліся істотнымі перашкодамі ў іх грамадска-палітычнай дзейнасці. Канкрэтныя асобы або кагалы былі асноўнымі фінансістамі магнатаў, каралеўскага двара, кліру і, такім чынам, маглі ўскосна ўплываць на агульнадзяржаўную палітыку, умешвацца ў самыя розныя пытанні [12, s. 30–31; 13].

Яўрэйскае насельніцтва было адносна аўтаномнай супольнасцю, якая функцыяніравала паміж рознымі слаямі тагачаснага грамадства, а яго культура, дастаткова спецыфічная, не была індыферэнтнай нават да хрысціянскага мастацтва [13]. Нацыянальная ментальнасць часта перарастала наднацыянальную адметнасць культуры. Уласна кажучы, гэта толькі ўмоўна дзве розныя велічыні. Злітнасць іх існавання адлюстроўвае не толькі логіка ацэнак і супастаўленняў, але і рэальныя факты, творчасць шэрагу майстроў, такіх як, напрыклад, К. Гескі, Г. Ляйбовіч. Нарэшце трэба прызнаць і тое, што шмат якія працэсы грамадска-культурнага жыцця на працягу XVII–XVIII стст. інспіраваліся, падтрымліваліся менавіта яўрэйскім насельніцтвам, поруч з якім выступалі і іншыя этнічныя групы, як, напрыклад, армяне. Дзякуючы вытворча-гандлёвым сувязям яўрэяў і армян на тэрыторыі Рэчы Паспалітай актыўна падтрымлівалася арыенталістычная накіраванасць мастацтва, духоўнай і матэрыяльнай культуры частак сацыяльнай эліты грамадства [14, s. 15–88; 15; 16, s. 117–172; 17; 18, с. 7–15; 19, с. 169–177].

У дапаўненне разгляду этнічнай структуры грамадства ўсходніх зямель Рэчы Паспалітай трэба назваць яшчэ адну дастаткова кампактную і ўплывовую групу насельніцтва – татар. Першыя гістарычныя звесткі аб іх адносяцца да XIV ст. – часоў Альгерда, Вітаўта і Ягайлы. Конніца Джанібека прымала ўдзел у ваенных паходах князя Альгерда 1350 і 1352 гг. Паслугамі татар карыстаўся і князь Вітаўт. У 1387 г. на сваіх землях ён прымае хана Тахтамыша з сям'ёй і воінамі, а цераз два гады пасля пераможнага паходу на Крым садзіць яго на трон. У 1409 г., напярэдадні Грунвальдскай бітвы, у Брясці Вітаўт і Ягайла разам з ханам Джэладэд-Дзінам абмяркоўваюць планы вайны з Тэўтонскім ордэнам. На баку аб'яднаных войск Вялікага Княства Літоўскага і Польшчы выступіла войска татар, што адыграла пэўную ролю ў пераможным завяршэнні бітвы.

Рассяленне татар на беларускіх землях было абумоўлена дзвюма прычынамі – ваеннымі дзеяннямі з Ардой, пасля якіх значныя групы палонных аказваліся на тэрыторыі княства, і міграцыямі (збеглыя ханы, прэтэндэнты на ханскі трон), у выніку якіх перасялялася галоўным чынам знаць, вайскоўцы. Паступова сфарміраваліся асобныя раёны, дзе аседла пражывалі татары (Клецк, Мінск, Гродна, Крэва, Лідскі, Ашмянскі, Навагрудскі, Брэсцкі паветы) [20, с. 492]. Бяднейшая частка жыхароў дзяржавы займалася рамёствамі, гандлем, агародніцтвам, жывёлагадоўляй.


*ISSN 2523-4234 Наук. щоріч. Історія релігій в Україні, 2019, Вип. 29*

Для нашай праблемы большую цікавасць уяўляюць заможныя татары – служылыя людзі (бекі, мурзы, уланы), якія па сваіх правах прыраўніваліся да шляхты. Гістарычныя дакументы захавалі адпаведную назву – “шляхта-мусульмане”. Прадстаўнікі гэтай катэгорыі валодалі зямлёй, нерухомасцю. У XVII–XVIII стст. існавалі генеалагічныя зводы, дзе ўказваліся знатныя роды не толькі польска-літоўскага паходжання. Адзін з такіх зводаў (перавыданне 1895 г.) змяшчае таксама звесткі аб шляхце татарскага паходжання [5, с. 89; 21].

Наяўнасць у краіне значнай колькасці татарскага насельніцтва, занятага ваеннай справай, вымагала дзяржаўныя ўлады клапаціцца аб іх правах, устанаўліваць некаторыя абмежаванні. Так, Жыгімонт Аўгуст II у 1561, 1568 гг., Стэфан Баторый у 1576 г., Жыгімонт III у 1608 г., Уладзіслаў IV у 1634 г. выдаюць прывілеі, дзе пацвярджаюць правы татарскай знаці. Але гэтыя факты сведчаць і аб тым, што ў складанай сістэме грамадска-палітычных, саслоўных адносін Рэчы Паспалітай татары былі не апошнімі. Іх роля ўзрастае, калі гаворка ідзе аб культурных працэсах XVII–XVIII стст. Можна лічыць, што сфарміраваныя і абумоўленыя рознымі фактарамі сармацка-арыенталістычныя з’явы тагачаснага жыцця падтрымліваліся таксама і татарскім насельніцтвам.

Усведамленне этнічнай сітуацыі на землях Вялікага Княства Літоўскага ў XVII–XVIII стст. і яе ўплываў на гісторыка-культурныя працэсы не можа адбыцца без уліку яшчэ некалькіх этнічных груп – украінцаў, літоўцаў, латышоў, цыганоў. У параўнанні з ужо названымі палякамі, рускімі, яўрэямі, татарамі гэта былі прадстаўнікі тых этнасаў, якія аказалі абмежаванае ўздзеянне на культурную сітуацыю ў дзяржаве. У сувязі з невялікай колькасцю па прычыне рассялення пераважна на пагранiччы (акрамя цыганоў), нязначнай інтэграванасцю ў сацыяльную структуру грамадства яны шмат у чым саступалі ў сваёй уплывовасці ў параўнанні з вышэй разгледжанымі групамі насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага. Але гэта не дае падстаў адмаўляць іх пэўнага ўкладу ў агульнадзяржаўныя, культурныя працэсы. Спарадычныя, апасродкаваныя, існуючыя пераважна на ўзроўні нізоў грамадства, такія ўплывы, безумоўна, былі.

Апошняй і, магчыма, самай галоўнай праблемай, да якой неабходна звярнуцца пры аналізе гістарычных умоў стылявога развіцця мастацкай практыкі на Беларусі XVII–XVIII стст., з’яўляецца канфесійная сітуацыя. Яна з’яўляецца надзвычай складанай, дынамічнай для дадзенага перыяду, часам супярэчлівай. Таму абмяжуемся некаторымі агульнымі заўвагамі. Хрысціянскае светаўспрыманне вызначала ўсе сферы жыцця дзяржавы: палітыку, ідэалогію, культуру, мастацкую практыку. Дзякуючы яму, ажыццяўлялася ўзаемасувязь паміж гэтымі сферамі, узаемаабумоўленасць іх асобных частак. Носьбітамі тэалагічных канцэпцый былі канкрэтныя людзі, прадстаўнікі пэўных этнічных і саслоўных груп. Веравызнанне асобы было той галоўнай кропкай адліку, у якой перасякаліся і прыватныя, і агульнадзяржаўныя інтарэсы, вялікая палітыка краіны і лёс канкрэтнага чалавека, сям’і.

Структура грамадства Вялікага Княства Літоўскага была поліканфесійная. Яе аснову складалі каталіцкая, уніяцкая, праваслаўная і пратэстанцкая канфесіі. У нацыянальнай культуры роля кожнай з іх была неаднолькавай, як і адпаведны ўклад, узровень уплываў. З другога боку, таксама відавочна перыядычнасць, з якой тая ці іншая канфесія дамініравала ў дзяржаве, ці на яе асобных рэгіёнах, вызначаныя фазы іх найбольш актыўнага функцыянавання. Нарэшце звяртае на сябе ўвагу і спецыфічнасць узаемаадносін названых канфесій. Барацьба, супрацьстаянне, варожасць, адкрытая ці тайная канфрантацыя – усё гэта прысутнічала ў іх узаемаадносінах, накладвала адбітак на стан грамадства, па-свойму пераламлялася ў яго культуры, мастацтве. Уплыў канфесій з'яўляўся асноўнай рухаючай сілай, якая падпарадкоўвала сабе і свецкае жыццё. Спецыфічнасць развіцця ўсходніх тэрыторый Рэчы Паспалітай якраз і заключаецца ў тым, што іх рэлігійная накіраванасць станавілася важнейшай часткай усіх галін грамадства.

Насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага да Крэўскай уніі 1385 г. была ў пераважнай большасці праваслаўнага веравызнання. Істотныя змяненні канфесійнай сітуацыі пачынаюцца пасля яе прыняцця, паколькі ўнія адкрыла шлях да пашырэння каталіцызму на беларускіх землях. У адпаведнасці з каралеўскімі і велікакняжацкімі дэкрэтамі, прывілеямі некаталіцкае насельніцтва абмяжоўвалася ў правах, на яго дзейнасць накладваўся шэраг забарон, як, напрыклад, забарона займаць вышэйшыя дзяржаўныя пасады. Ступень, як і стабільнасць такіх абмежаванняў, была неаднолькавай. Перыядычна, у залежнасці ад існуючай ці чакаемай сітуацыі, дзяржаўная ўлада здымала забароны, уводзіла нормы, якія ўраўноўвалі ў правах каталіцкае і праваслаўнае насельніцтва, як, напрыклад, па Віленска-Радамскай уніі 1401 г.

Прынцыпова важным этапам для фарміравання і развіцця культурнай сітуацыі можна лічыць сярэдзіну – другую палову XVI ст. Менавіта з гэтага часу адбываецца распаўсюджанне пратэстантызму (кальвінізму, антытрынітарызму). Для беларускіх зямель была ўласціва амаль адначасовая прысутнасць Рэфармацыі і Контррэфармацыі. Згасанне аднаго руху і пашырэнне другога ішлі на фоне складаных унутрыдзяржаўных працэсаў, вынікам якіх можна лічыць Брэсцкую царкоўную унію 1596 г., паклаўшую пачатак яшчэ адной канфесіі – уніяцкай. Па сутнасці, другая палова XVI – першая палова XVII ст. – час, які праходзіў пад знакам бурных змен у рэлігійнай структуры дзяржавы.

З пачатку XVII ст. канфесійная сітуацыя акрэслівалася дынамічнымі суадносінамі каталіцызму, уніяцтва, праваслаўя. Яны ахоплівалі розныя слаі насельніцтва, знаходзячы ў кожным з іх свае прыярытэты, сваіх прыхільнікаў. У адпаведнасці з гэтым стваралася багацце ўмоў для культурнага развіцця грамадства. Першая палова XVII ст. вызначалася прымусовымі спосабамі пашырэння ўніяцтва, якое падтрымлівалася таксама касцёлам. З цягам часу ўніяцтва ўкаранілася ў сярэдніх і ніжэйшых слаях грамадства, знаходзячы менавіта там спрыяльную глебу для рэалізацыі сваёй дактрыны, ваё кола прыхільнікаў [22, с. 168]. Яно стала своеасаблівым культурна-камунікацыйным мостам паміж

каталіцызмам і праваслаўем, а таксама важным кансалідуючым і акумуліруючым асяродкам.

Каталіцызм ператвараецца ў рэлігію эліты, у руках якой канцэнтруюцца кіруючыя пасады, матэрыяльныя сродкі. Паступова пашырэнне ўніяцтва губляе прымусовы, агрэсіўны акцэнт. У гэтым не малую ролю адыграла пазіцыя касцёла і стаўленне праваслаўнай царквы, а таксама больш уважлівая палітыка ўласна ўніяцкіх лідэраў. Імкліваму распаўсюджанню ўніяцтва спрыялі таксама стыхійныя элементы народнай культуры, якія аказаліся для яе прымальнымі.

Канфесійны склад насельніцтва як усёй Рэчы Паспалітай, так і Вялікага Княства Літоўскага ў ацэнках беларускіх гісторыкаў выглядае наступным. У пачатку XVII ст. уніяты складалі 3 млн. сярод жыхароў княства (у склад якога ўваходзілі і беларускія землі), у канцы XVIII ст. – 1,8 млн. вернікаў-беларусаў [20, с. 66; 23, с. 10–11]. Некалькі іншыя лічбы даюцца ў даследаваннях польскіх аўтараў. Так, па падліках Л. Бянькоўскага, у 1772 г. з 14,7 млн. жыхароў Рэчы Паспалітай 7,4 былі каталікамі, 6,2 – вернікамі ўсходніх цэркваў. З іх, зноў жа па падліках Л. Бянькоўскага, у 1800 г. 3,4 млн. складалі грэка-каталікі, 2,8 млн. – праваслаўныя [24, s. 779–837].

Другім важным паказчыкам для вызначэння культурнай сітуацыі на беларускіх землях з’яўляюцца колькасныя суадносіны каталіцкага, праваслаўнага і ўніяцкага насельніцтва. З пачатку XVII да канца XVIII ст. назіраецца павелічэнне колькасці ўніятаў і каталікаў за кошт праваслаўных і пратэстантаў. Па падліках гісторыкаў, у сярэдзіне XVII ст. 33% насельніцтва Рэчы Паспалітай складалі ўніяты, 43% – каталікі, 10% – праваслаўныя, 14% – прадстаўнікі іншых рэлігій [20, с. 137]. У канцы XVIII ст. на тэрыторыі Рэчы Паспалітай існавала каля 4,5 тыс. лацінскіх парафій, 9,5 тыс. уніяцкіх, 0,5 тыс. праваслаўных прыходаў [25, с. 156–157]. Я. Мараш, разглядаючы канфесійную структуру Беларусі XVIII ст., піша, што колькасць уніяцкіх прыходаў перавышала колькасць каталіцкіх і праваслаўных, разам узятых [26, с. 225–226].

Рассяленне каталіцкага, уніяцкага і праваслаўнага насельніцтва мела свае адметнасці. Каталіцкія парафіі канцэнтраваліся на Гродзеншчыне, Ашмяншчыне, у Лідскім, Навагрудскім, Брэсцкім і Мінскім паветах, праваслаўныя прыходы – у Пінскім, Ваўкавыскім і Мазырскім, уніяцкія прыходы пераважалі ў паўночнаўсходніх, цэнтральных і паўднёвых паветах.

Акрамя каталікаў, уніятаў і праваслаўных істотную ролю ў культурнай сітуацыі адыгрывалі прадстаўнікі іншых канфесій – іўдзеі, пратэстанты, стараабрадцы, мусульмане, караімы. Гісторыкі, называючы колькасць вернікаў гэтых канфесій, часам разыходзяцца ў лічбах. Разам з тым, спасылаючыся на найбольш грунтоўныя працы, можна прызнаць наступнае: у канцы XVIII ст. на тэрыторыі Рэчы Паспалітай пражывала 900 тыс. іўдзеяў, 365 тыс. пратэстантаў, 20 тыс. старавераў, 4 тыс. мусульман, 1,3 тыс. караімаў. Кожная з названых канфесій была ў рознай ступені інтэгравана ў грамадска-палітычнае, эканамічнае і культурнае жыццё дзяржавы.

Дынаміка колькасных змен канфесійнага складу насельніцтва Рэчы Паспалітай і яе беларускіх зямель вывучана толькі ў агульных аспектах. Разам з тым прыведзеныя паказчыкі з'яўляюцца важнейшымі пры ацэнцы культурнай сітуацыі, паколькі кожная з канфесій фарміравала свае асяродкі, рэгламентавана-арганізаваныя ўтварэнні, уступала ў living рознабаковыя сувязі з іншаверцамі.

На працягу XVI–XVIII стст. Рэч Паспалітая і Беларусь знаходзіліся ў цэнтры міжканфесійнага і культурнага еўрапейскага дыялогу. Традыцыйна этнаканфесійная сітуацыя на беларускіх землях ацэньваецца як канфрантацыйная. Аднак яна выглядае больш складанай і не такой адназначнай. Менавіта ў XVII–XVIII стст. узрастаюць інтэграцыйныя працэсы, што з відавочнасцю пацвярджаецца самім стылем барока, які аб'яднаў, нягледзячы на канфесійныя і этнічныя адрозненні, культуру розных рэгіёнаў Еўропы, розных этнасаў. Адкрытая ці завуаліраваная канфесійная канфрантацыя садзейнічала, як гэта ні дзіўна, культурнаму абмену.

Культура беларускіх зямель эпохі барока, убачаная ў агульнаеўрапейскім кантэксце, дазваляе з відавочнасцю прызнаць, што яе характар, адметнасці склаліся як вынік працяглага ўзаемадзеяння, кантактаў розных канфесій. Поліканфесійная сітуацыя не заўсёды супадала з этнічнай структурай соцыума, у выніку чаго ўзнікаў своеасаблівы дыялог канфесій, культур, ментальнасцей, якія належалі да розных гістарычна акрэсленых рэлігійных арэалаў.

З улікам шэрагу фактараў, умоў, у якіх разгортвалася матэрыяльна-духоўная дзейнасць асобы, можна зрабіць наступныя вывады. Важнейшае значэнне для развіцця барочнага стылю, набыцця ім своеасаблівых нацыянальных рыс мелі тыя рэгламентавана-арганізаваныя формы дзейнасці, якія, як і светапоглядныя канцэпцыі, ментальнасць індывідуума, прайшлі складаны эвалюцыйны шлях. Цэхавая, карпарацыйная сістэма дыктавала адпаведныя формы паводзін асобы, уплывала на яе мастацкую дзейнасць. Менавіта ў гэтых параметрах фарміраваліся адносіны заказчыка і выканаўцы, складваўся інстытут мецэнацтва. Сярэднявечнае становішча творцы ў грамадстве мянялася паступова. У гэтым не апошнюю ролю адыгралі элементы адукацыйнай сістэмы Беларусі эпохі барока: цэхі з іх рэгламентаванасцю вучэбнага працэсу, брацкія школы, навучальныя ўстановы каталіцкіх і уніяцкіх ордэнаў, а таксама прыватная і замежная адукацыя.

Своеасаблівай рысай, якая адрознівала ўмовы рэалізацыі матэрыяльных, эстэтычных, этычных запатрабаванняў асобы, з'яўляецца адкрытасць, цесная спалучанасць гэтых умоў з існуючымі на той час сістэмамі і асяродкамі Еўропы. Цераз адпаведныя формы ў нацыянальную культуру ўваходзілі новыя ідэалы, пашыраліся шляхі самапазнання чалавека, ускладняліся яго адносіны да свету. Рысы барочнай ментальнасці фарміраваліся на фоне складанай этнічнай і канфесійнай структуры грамадства. Гэта былі найбольш важныя фактары, дзякуючы якім у нацыянальную мастацкую традыцыю ўключаліся з'явы, не толькі народжаныя ў самой культурнай сітуацыі, але і дэтэрмінаваныя знешнімі фактарамі.

Разгледжаныя ўмовы мастацкай, культурнай дзейнасці асобы аказвалі непасрэднае ўздзеянне на выпрацоўку ў мастацкай практыцы барочнага стылю шэрагу тэндэнцый развіцця, такіх як рэтраспектыўна-спадчынныя, “нізавога барока”, антыкізацыі, арыенталістычных настрояў. Яны фарміравалі адметныя рысы мастацкай мовы, якія ўвасобіліся ў паэтыцы барочнага стылю.


1. Morzy J. Kryzys demograficzny na Litwe i Białorusi w drugiej połowie XVII wieku. Poznań, 1965. 420 s.

2. Мелешко В. И. Очерки аграрной истории Восточной Белоруссии (Вторая половина XVII–XVIII вв.). Минск: Наука и техника, 1975. 247 с.

3. Голубеў В. Ф. Сялянскае землеўладанне на Беларусі XVI–XVIII стст. Мінск: Навука і тэхніка, 1992. 176 с.

4. Карпачев А. М., Козловский П. Г. Динамика численности населения Белоруссии во второй половине XVII–XVIII в. // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы, 1968. Ленинград: Наука, 1972. С. 86–92.

5. Этнаграфія беларусаў. Гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя. Мінск: Навука і тэхніка, 1985. 215 с.

6. Анішчанка Я. З гісторыі міграцыйных працэсаў на тэрыторыі Усходняй Беларусі ў другой пал. XVIII ст. // Весці АН БССР, сер. грам. навук. 1990. № 5. С. 57–64.

7. Статут Вялікага княства Літоўскага. 1580. Тэксты. Даведнік. Каментарыі. Мінск: БелСЭ, 1989. 573 с.

8. Катунский А. Старообрядчество. Москва: Политиздат, 1972. 120 с.

9. Iwaniec E. Z dziejów staroobrzędowców na ziemiach polskich XVII–XX w. Warszawa, 1977. 260 s.

10. Короткая Т. П., Прокошина Е. С., Чудникова А. А. Старообрядчество в Белоруссии. Минск: Наука и техника, 1992. 115 с.

11. Копысский З. Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI – первой половине XVII в. Минск: Наука и техника, 1966. 220 с.

12. Smoleński W. Stan i sprawa żydow polskich w XVIII wieku. Warszawa, 1876. 217 s.

13. Bałaban M. Z historii żydow w Polsce. Szkice i studia. Warszawa, 1920. 176 s.

14. Baranowski W. Swiat isłamu. Łodź, 1987. 250 s.

15. Baracz S. Zywoty sławnych ormian w Polsce. Lwow, 1856. 485 s.

16. Gębarowicz M. Materiały żródlowe do dziejów kultury i sztuki XVI–XVIII w. Wrocław, 1973. T. 3. 447 s.

17. Mańkowski T. Sztuka ormian lwowskich // Prace Komisji Historii i Sztuki PAU. 1934. T. 6. S. 61–163.

18. Лазука Б. А. Слуцкія паясы і еўрапейскі тэкстыль XVIII ст. Малы лексікон. Мінск: Беларусь, 2015. 172 с.

19. Лазука Б. А. У засені замкаў і палацаў. Матэрыяльная культура сацыяльнай эліты Беларусі XII – пачатку XX стагоддзя. Мінск: Беларусь, 2018. 320 с.

20. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. Мінск: Бел сэ, 1989. 575 с.

21. Wolff J. Kniażiowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku (rozdzial “kniaziowie tatarscy”). Warszawa, 1895. 742 s.

22. Зайкоўскі Э. Роля канфесійнага фактару ў нацыянальнай свядомасці беларусаў // Беларусіка. Кн. 2. Фарміраванне і развіццё нацыянальнай самасвядомасці беларусаў / Матэр. міжн. нав. канф. 19–20 жніўня 1992 г. Мінск, 1992. 403 с.

23. Лазука Б. А. Гісторыя беларускага мастацтва: у 2 т. Мінск: Беларусь, 2007. Т. I: Першабытны лад – XVII стагоддзе. 254 с.; Т. II: XVIII – пачатак XXI стагоддзя. 352 с.

24. Bieńkowski L. Organizacja kościoła wschodniego w Polsce XVI–XVIII w. T. II // Kościół w Polsce: Wieki XVI–XVIII. Kraków, 1969. S. 179–209.

25. Клачоўскі Е. Беларусь, Літва і Украіна ў "Атласе" грамадска-рэлігійнай гісторыі Рэчы Паспалітай многіх народаў // Беларусіка, 3. Мінск, 1994. 403 с.

26. Мараш Я. Н. Очерки истории экспансии католической церкви в Белоруссии XVI–XVII в. Минск: Вышэйшая школа, 1974. 288 с.

SUMMARY

**Barys Lazuka**

**Confessional and ethnic conditions of development of the Baroque style in the art of Belarus**

The regularities of the development of the Baroque style in the plastic arts of Belarus in the context of the conditions of the historical process, due to the complex of socio-political, class, religious, educational, economic circumstances, are considered. The confessional and ethnic composition of the society of the Belarusian lands, which in the second half of the XVI–XVIII centuries were part of the Grand Duchy of Lithuania, is singled out from their totality. Attention is drawn to the close relationship of religious and ethnic factors. It is noted that the population of the Belarusian lands was not stable, which led to military action, migration, variability of economic, political and religious situations in the state.

In terms of the number of believers and the influence on cultural and artistic processes in society, the main confessions in the XVII–XVIII centuries were Catholic, Uniate and Orthodox. Their role depended on the periodicity of domination, phases of active functioning, specificity of relationships. The transformation of Catholicism into a religion of the elite, the expansion of the Uniate Church in the middle and lower parts of the society, its orientation to national culture, the conservative attitude of Orthodoxy to the arts were the factors that had a direct influence on the stylistic processes of the Baroque era.

The attitude of these confessions to art, its role in the administration of worship were different. The most balanced were the relations of the Catholic confession, which evaluated art as an important means of emotional perception of Scripture in artistic images. The transformation of Catholicism into a religion of the elite, the expansion of the Uniate Church in the middle and lower strata of society, its focus on elements of popular culture, the conservatism of the relationship of Orthodoxy to the arts – the factors that had a direct impact on the stylistic processes throughout the Baroque era.

Attention is drawn to the role of representatives of other faiths – Protestants, old believers, Jews, Muslims, who also influenced the development of the Baroque style.

During the XVII–XVIII centuries, the Belarusian lands were in the center of the European interfaith and cultural dialogue. Features of their culture at this time were due to the multi-confessional society, were the result of long-term interaction and contacts of different faiths.

*Keywords:* Baroque style, plastic arts, confessions, Catholicism, Orthodoxy, Uniatism